*Т.У.Вайцяхоўская, аспірант*

# БЕЛАРУСКІ АЎТЭНТЫЧНЫ КАСЦЮМ У СУЧАСНАЙ СЦЭНІЧНАЙ ПРАКТЫЦЫ

У тым, што народны касцюм з'яўляецца адной з яркіх праяў культуры любога этнасу, не трэба пераконваць нікога. Аднак вельмі важна яго разуменне не толькі як аб'ектыўна існуючай і візуальна ўспрымаемай рэаліі, што прадстаўлена разнастайнасцю часава-прасторавых варыянтаў, але і як складанай знакавай сістэмы, якая праз састаўныя часткі комплексу, арнамент, колер, іх узаемадзеянне паміж сабой адлюстроўвае асаблівасці народнага светапогляду, характар беларусаў, іх культурныя асаблівасці.

Эстэтыка і функцыянальнасць натуральнага аўтэнтычнага святочнага народнага касцюма адпавядае рэпертуару беларускага музычна - песеннага і танцавальнага фальклору. Змест адзення мае універсальны характар, таму аўтэнтычны касцюм аднолькава эстэтычна выглядае і ў тым выпадку, калі ў ім выступаюць статычныя харавыя калектывы, і ў тым, калі выконваецца танцавальны фальклор.

“За эталон нацыянальнага беларускага касцюма прыняты сёння тыя рэгіянальныя формы сялянскіх і местачковых строяў (комплексаў адзення), якія бытавалі на тэрыторыі Беларусі на мяжы XIX–XX стст” [3, с. 2]. Многія выканаўцы фальклору, асабліва маладзёжныя аматарскія калектывы, накіроўваюцца ў фальклорныя экспедыцыі, дзе запісваюць народныя песні ад захавальнікаў мясцовай фальклорнай традыцыі, адшукваюць і набываюць старадаўняе народная адзен-не і потым выкарыстоўваюць іх у сваіх выступленнях або робяць копіі народных строяў, захаваных у музеях Беларусі.

Агульны для ўсёй нашай краіны комплекс народнага касцюма (у жаночых строях гэта сарочка, андарак, гарсэт, галаўны ўбор, чаравікі; у мужчынскім – кашуля, нагавіцы, пояс, світа, боты, галаўны ўбор) мае шырокі спектр разнавіднасцей, адметнасцей. Яны дазваляюць атаясамліваць носьбітаў гэтых строяў з пэўнай тэрытарыяльнай зонай, вёскай, таксама з пэўным узроставым і сямейным становішчам ці роляй у канкрэтным святочным абрадзе. Мужчынскі народны касцюм Беларусі вызначаецца меншай рэгіянальнай разнастайнасцю ў параўнанні з жаночым, але асобныя адметнасці прысутнічаюць і ў ім.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

У апошнія дзесяцігоддзі XX ст. мастацкае жыццё краіны было даволі разнастайным. У кожнай вобласці працавалі метадычныя аб’яднанні, якія працягваюць сваю работу і цяпер. Яны вывучаюць аўтэнтычны касцюм і на яго аснове распрацоўваюць сцэнічныя варыянты. У Мінску вылучаецца сваімі творчымі работамі цэнтр народных рамёстваў “Скарбніца”.

Работа над касцюмам складае частку праграмы развіцця духоўных каштоўнасцей грамадства. Нараджаецца як адзін з напрамкаў стыль, заснаваны на рэканструкцыі народнага адзення [2, с. 144].

Асаблівае месца ў захаванні касцюма займаюць самадзейныя мастакі і мясцовыя энтузіясты, якія самі шыюць аўтэнтычныя ці максімальна блізкія да іх касцюмы.

Пэўную ролю ў фарміраванні аўтэнтычнага сцэнічнага касцюма адыгрываюць фабрыкі мастацкай прамысловасці, дзе можна сустрэць як добрыя ўзоры касцюмаў, так і няўдалую падробку пад аўтэнтычныя.

Відавочны і ўплыў моды на мастацтва сцэнічнага аўтэнтычнага касцюма, што бачна на кожным этапе яго развіцця: спадніцы то ўкарочваюцца, то становяцца доўгімі, то больш шчыльна прылягаюць да стану або, наадварот, набываюць аб'ёмнасць, матывы то ўзбуйняюцца, то становяцца вельмі далікатнымі.

Сёння назіраецца вялікая цікавасць і да натуральных аўтэнтычных формаў беларускага касцюма. Шматлікія самадзейныя фальклорныя калектывы рашаюць задачы сваёй адметнасці праз вывучэнне карэнных мясцовых строяў, іх развіцця ад старажытных формаў да сучасных.

Сцэнічны народны касцюм зараз, як ніколі раней, дэманструе някідкую прыгажосць і арганічнасць. Арнаментальныя матывы вяртаюцца ў свае натуральныя памеры, выклікаюць увагу і цікавасць разнастайныя тэхнікі аздаблення, у касцюме пераважае натуральная тканіна.

---

*1. Исенко С. П.* Русский народный костюм и его сценическое воплощение. – М., 1999. – 144 с.

*2. Маленка Л. І.* Беларускі народны касцюм. — Мн., 2001. – 160с.

*3. Піскун Ю.А.* Варыятыўнасць інтэрпрэтацыі народнага касцюма ў сцэнічна-выканальніцкай дзейнасці мастацкіх калектываў Беларусі. – Мн., 2003. – 35с.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ